Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЖНІЎНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 159 (28017) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Першы раз — у першы клас**

СТАР. 4



**Аляксандр Дасужаў, ці проста DOS**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**77,6%**

*запланаванага на год жылля ўведзена ў эксплуатацыю сёлета ў студзені-ліпені. Арганізацыямі ўсіх форм уласнасці пабудавана 33,4 тысячы новых кватэр. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1 261,3 тысячы кв.м агульнай плошчы, або 40,6% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. У параўнанні са студзенем-ліпенем 2014-га ўвод у эксплуатацыю жылля для грамадзян гэтай катэгорыі зменшыўся на 334,1 тысячы кв.м. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 892,9 тысячы кв.м агульнай плошчы жылля, або 28,8% ад агульнага ўводу па рэспубліцы.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 16 498,00 | ▲ |
| Еўра | 18 337,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 246,30 | ▼ |
| Укр. грыўня | 743,99 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# СВОЙ КУТОК



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

*Аляксандр КАТАНЕКША працуе механізатарам ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Эксперыментальная база імя Катоўскага» Узденскага раёна. Яго жонка Юлія — у дэкрэтным адпачынку. Сужэнцы выхоўваюць дваіх дзяцей. Аляксандры пяць гадоў, а яе малодшаму брацiку Арцёму споўнілася два.*

*Гэтай вясной у маладой сям'і нарэшце з'явілася сваё жыллё: гаспадарка выдзеліла новы дыхтоўны катэдж у вёсцы Возера: тры жылыя пакоі, кухня, калідор, цэнтралізаванае водазабеспячэнне, газ, каля дома ладны ўчастак зямлі. Юлія і Аляксандр ужо абсталявалі дом усім неабходным: збіралі грошы на мэблю, бытавую тэхніку.*

*— Толькі той, хто ніколі не меў жылля, можа адчуць, якая гэта радасць — свой куток, — распавяла гаспадыня. — Пяць гадоў таму мы вырашылі пераехаць з Мінска, дзе муж працаваў на трактарным заводзе, у вёску. А чаго трымацца за той горад, калі не мелі ўласнай кватэры, а пабудаваць кааператыўную не было магчымасці. Нават пакой у інтэрнаце нам прадпрыемства не змагло выдзеліць — чарга. Даводзілася арандаваць жылплошчу ў чужых людзей.*

*— У наступным годзе мяркуем пасадзіць фруктовыя дрэўцы, разбіць газоны, паставіць цяпліцу, завесці хатнюю жывёлу, — дзеліцца сваімі планамі Юлія.*

*У горад, як прызнаюцца муж і жонка, іх не зацягнеш і на вяроўцы. Тут прастора, чыстае паветра, ёсць работа, дах над галавой. На жыццё грэх скардзіцца.*

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Дашкольны лікбез

## ПЯЦЬ ЗЯЛЁНЫХ МАКАРОН...

### Калі першакласнік не хоча вучыцца, значыць, ён не нагуляўся

**Хадзіць у школу і вучыцца — дзве розныя рэчы. На жаль, часам, гэта высвятляецца толькі пасля таго, як першакласнік аказваецца не ў стане ўспрымаць сябе ў новым статусе і не разумее, чаго ад яго ўвогуле хочуць. Што ж павінна ўмець і ведаць дзіця, знаходзячыся на «парозе школы»? Як даведацца, што яно псіхалагічна падрыхтавана да сустрэчы з новым, і што рабіць, каб не аддаць у школу гультая?**

### МАЛЕНЬКІЯ ПАПЯЛУШКІ І МАМА-СУДДЗЯ

Хітрыкамі выхавання ў малых жадання вучыцца падзялілася **Васіліна ЖАРНАК, выхавацель 1-й кваліфікацыйнай катэгорыі дзіцячай установы № 218 г. Мінска.**

*— Часта дзеці на пытанне «Чаму ты хочаш у школу?» адказваюць: «Там можна насіць прыгожы ранец»... Там вучыцца мой брат». Але ніводзін не кажа, што хоча ў школу, каб атрымаць новыя веды, і задача бацькоў і выхавацеляў — сфарміраваць правільную матывацыю на праяўленне цікавасці да вучобы. Каб прывіць малечы неабходныя для вучня ўвагу, усідлівасць, памяць, дапытлівасць, дастаткова штодня з імі гуляць і размаўляць на розныя тэмы. Калі дзеці задаюць нейкае пытанне, я часткова адказваю на яго, а потым дадаю, што больш грунтоўна ім пра гэта раскажа настаўнік у школе, які ведае больш за мяне і растлумачыць цікавей.*

*Каб праверыць і замацаваць памяць, а таксама папоўніць слоўнікавы запас дзяцей, я гуляю з імі ў словы. Для кожнага па чарзе называю 10 прадметаў і прашу паўтарыць, што запомніў. Калі малое ў стане ўзнавіць ад трох да шасці назваў, значыць, памяць добрая. Прапаноўваю адшукаць лішнюю картачку ў шэрагу малюнкаў і патлумачыць, чаму менавіта яна не падыходзіць да астатніх. Гэта выдатна развівае логіку. Самастойныя гульні з цацкамі — таксама важны момант, бо дзеці разам нешта прыдумваюць. Я дазваляю прыносіць свае, каб прывучаць іх дзяліцца адно з адным.. Але на некаторыя цацкі ў мяне забарона. Чаму вучаць, напрыклад, модныя лялькі-монстры?*

Каб развіць мысленне і фантазію малых, выхавацелі праводзяць «навуковыя» эксперыменты. Дзеці даследуюць, як мяняецца вада, калі ў яе дабавіць фарбы, каштуюць вадкасць у падсаладжаным ці падсоленым выглядзе, з завязанымі вачыма на пах або смак вызначаюць часнок, апельсін, лімон. Гэтую справу можна з поспехам працягваць і дома. Напрыклад, паказаць станы вады: звычайны, замарожаны, пар з кіпню.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## ЦЁПЛА І СУХА

**Цёплае і сухое надвор'е захаваецца ў Беларусі да сярэдзіны наступнага тыдня. Аб гэтым паведаміў начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Аляксандр БЯГАНСКІ.**

У суботу ў большасці раёнаў краіны ападкі не прагназуюцца, толькі днём месцамі па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ноччу складзе 6-13 градусаў, днём — ад 20 да 27. У нядзелю ападкаў таксама не чакаецца. Ноччу будзе ад 6 да 13, па паўднёвым захадзе месцамі да 15 радусаў, днём — 22-27 градусаў цяпла.



У пачатку наступнага тыдня, 24-25 жніўня, будзе без ападкаў. Тэмпература паветра ноччу — 8-15 градусаў, днём — ад 20 да 27, месцамі да 29 градусаў.

У сувязі з працяглым перыядам сухога надвор'я захоўваецца складаная пажаранебяспечная абстаноўка ў лясах